# Рабочая смена

№2 Октябрь2024г.

Общественно-информационное издание ГК электротехники г.Белоозерска


## ПАДЗЯКІ НАСТАЎНІКАМ



Напярэдадні Дня настаўніка, у пятніцу 4 кастрычніка, наш каледж наведала свята.

За некалькі хвілін да пачатку працоўнага дня прайшла акцыя пад дэвізам "павіншую педагога першым!", тым самым падарыўшы мэтрам педагагічнай справы і юным выкладчыкам радасны настрой.

Да гэтага часу ўжо стракацелі групавыя газеты са святочнымі віншаваннямі. А па калідорах і кабінетах навучальнай установы разліўся салодкі водар вясны, хоць за вокнамі гаспадарыла жаўтавокая восень.

У другой палове дня актавая зала каледжа сабрала працоўных і навучэнцаў на урачыстую праграму, дзе гучалі словы падзякі т віншавання НАСТАЎНІКАМ і ўсім тым, хто абслугоўвае навучальны працэс.



У гонар прафесійнага свята адбыўся цудоўны, цёплы, восеньскі канцэрт.

## СУСТРЭЧА З ПРАДСТАЎНІКАМІ РУП "БРЭСТЭНЕРГА

Традыцыйна ў каледжы праходзяць сустрэчы навучэн-цаў з прадстаўнікамі патэнцыйных працадаўцаў.



26.09.2024 адбылася сустрэча навучэнцаў каледжа з прадстаўнікамі філіялаў РУП "Брэстэнерга": "Баранавіцкія электрычныя сеткі", "Белаазёрскэнергарамонт", "Бярозаўская ДРЭС".

## В ЗДОРОВОМ ТЕЛЕ ЗДОРОВЫЙ ДУХ!!!



Спортивные площадки колледжа предлагают своим учащимся::

***мини-футбол***
понедельник и среда
– с 17.00 до 19.00

***волейбол***
понедельник, вторник, четверг
-с 17.00 до 18.00 (девушки)
-с 18.00 до 20.00 (юноши)

***фитнес***
понедельник, вторник, среда, четверг
– с 17.00 до 19.00



## ПАЧАТАК СПАРТЫЎНАГА СЕЗОНА



Развіццё спаборніцкага настрою, імкненне прытрымлівацца алімпійскага дэвізу "хутчэй, вышэй, мацней разам!" зрабілі нашу каманду па міні-футболе згуртаванай, мэтанакіраванай і баяздольнай.

Па лініі прафтэхадукацыі навучэнцы нашага каледжа штогод удзельнічаюць у абласных спаборніцтвах пад кіраўніцтвам педагога дадатковай адукацыі, трэнера Сяргея Рыгоравіча Крыскевіча.

Гэты год не стаў выключэннем. Вераснёўскі футбол зноў прымалі Баранавічы. Тут прайшлі і занальныя, і абласныя гульні. Тры дні па кругавой сістэме праводзіліся паедынкі паміж камандамі навучэнцаў мясцовых устаноў ПТА: Бярозы, вацэвічаў, Ганцавічаў, Баранавічаў, Новай Мышы і Белаазёрска.

(канчатак на с.2)

# ПАЧАТАК СПАРТЫЎНАГА СЕЗОНА



(канчатак, пачатак на с.1)

Усе імкнуліся паказаць сваю лепшую гульню, бо хацелі выйсці ў наступны круг спаборніцтваў.

Усяляла надзею на высокі вынік згулянасць каманды. Бо толькі трое першакурснікаў былі пачаткоўцамі ў камандзе. Астатнія сямёра ўжо не першы год абаранялі гонар каледжа на спартыўных арэнах горада, раёна і вобласці.

У зоне з 7 каманд наш каледж стаў лідэрам: Усе сустрэчы былі выйграныя. Заняўшы 1 месца ў сваёй зоне, мы выйшлі ў фінал вобласці. І вось апошні тыдзень верасня. У барацьбу за п'едэстал уступілі каманды Новай Мышы, Пінска, Лунінца, двух каледжаў Брэста і мы, белаазёрцы.

Каманда рэальна глядзела на ўзровень гульцоў. Першымі нам не стаць, а вось срэбра ўзяць - за яго можна не толькі памарыць, але і пазмагацца з супернікамі з Пінска. Мы на яго і ”замахнуліся”.

Як і меркавалася, самыя гарачыя баталіі разыграліся на пляцоўцы за другое месца. Абедзве каманды гулялі ў дынамічны футбол з багаццем яркіх і прыгожых момантаў.

Мы былі ў двух мячах ад другога месца. Але свісток пакінуў нас на трэцяй прыступцы п'едэстала. У выніку наша каманда стала ў вобласці трэцяй з 23 калектываў. Нядрэнна. Але " які салдат не марыць стаць генералам?»

Разам са мной пастаўленыя трэнерам задачы вырашалі энергічныя Аляксандр Жуковіч і Ягор Цюцін, Максім Чашун і Барыс Багрэй, Павел Дарасевіч і Максім Чарняўскі, Даніла Пунько і Іван Жук, Аляксандр Гучанка.

Дзмітрый Мікіціч,
член гуртка “ Юнкар”.

# ПЕРШЫЯ КРОКІ Ў ПРАФЕСІЮ



Упершыню пра існаванне зваркі, як пра прафесію, я пачуў яшчэ ў школе, а дакладней – у канцы 9 класа. Тады прыходзілі з каледжа педагогі і распавядалі нам пра сутнасць прафесій, па якіх рыхтуюць у нашай навучальнай установе.

Акрамя таго, у мяне шмат знаёмых і сваякоў, якія займаюцца зваркай. І мой тата адзін з іх.

Навучыўся трохі трымаць у руках электродатрымальнік год таму, калі дапамагаў аднаму прыяцелю ў зварцы «печкі-буржуйкі». Таму я маю ўяўленне і аб зварачным абсталяванні, і пра інструмент зваршчыка. І скажу больш: я ведаю, як працуе абсталяванне і як правільна яго выкарыстоўваць.

Яшчэ трохі і, дзякуючы ўрокам спецтэхналогіі і заняткам на вытворчым навучанні, я стану разбірацца ў маркіроўцы электродаў і іх прызначэнні. Пакуль яшчэ для мяне гэта цяжкавата.

У мінулым годзе, не маючы дастатковых навыкаў у зварцы, я вырашыў прыняць удзел у конкурсе на лепшага зваршчыка, які праходзіў у лютым месяцы. Умовы былі аднолькавыя для ўсіх. Тут я ўпершыню дакрануўся па-сапраўднаму да прафесіі электразваршчыка. І мне спадабаўся сам працэс зваркі.

А на выставу творчых работ, якая праходзіла адразу ж пасля конкурсу, я падаў фігурку. Яна называецца “Сава" і складаецца з падшыпніка, двух гаек і шайбаў, прутка. Ідэя менавіта гэтага выраба ўзнікла ў мяне яшчэ на конкурсе. Першапачаткова знайшоў матэрыялы, потым зачысціў месцы іх зваркі, па чарзе ўсё злучыў, зачысціў швы і пафарбаваў. Мне спадабаўся мой рукатворны выраб.



"Плюсы" прафесіі электразваршчыка я бачу ў тым, што можна ўладкавацца на высокааплатную працу ў любым кутку планеты – гэтая прафесія ўсюды запатрабаваная. Але ёсць і “мінусы": пры незахаванні правілаў тэхнікі бяспекі будзе наносіцца шкода здароўю.

Я ведаю, што электразварку ўжываюць пры рамонце машын, вытворчасці канструкцый, на заводах і на будоўлях… На сёння мне падабаюцца такія віды зваркі як ручная дугавая, паўаўтаматычная і TIG зварка. Газаэлектразваршчык, па-мойму, павінен валодаць шырокімі ведамі ў галіне зваркі, не ігнараваць інструкцыі, правілы, выконваць рэжымы зваркі.

Аб сучасным ужыванні зваркі я ведаю тое, што выпускаюцца і выкарыстоўваюцца новыя тэхналогіі. Напрыклад, зварка пад вадой. Або зварка TIG. Мне да спадобы малюнкі на метале, якія дае гэты від мастацкай зваркі.

У будучыні, пасля заканчэння каледжа, я думаю недзе павысіць свой узровень. Потым мару працаваць у добрай фірме і аказваць дапамогу людзям у зварачных работах, можа кагосьці навучу гэтай непростай, але займальнай справе.

Я рады, што бацькі падтрымліваюць мяне ў маім выбары.

*Яўген Мелех,*
член гуртка " Юнкор”

**Издатель: Белоозерский ГКэ**
**Адрес редакции:** 225215 г.Белоозерск,
Брестской обл. ул.Энергетиков, 8; тел/факс 29838,
**-mail:** ptu82@brest.by

**Редактор: Жанна Кулак**
**Редколлегия:** кружок «Юнкор»
**тираж:** 10
**При перепечатке материала ссылка на газету обязательна**